***ЮРАСЬ НЕРАТОК***

# ***ФОТААЛЬБОМ***

***ВЕРШЫ***

Мінск
УП “Тэхнапрынт”
2003

УДК 882.6-1
ББК 84(4Беи)-5
Н54

Нераток Ю.
ФОТААЛЬБОМ. Вершы/Ю. Нераток. – Мн.: УП “Тэхнапрынт”, 2003, – 80с.
ISBN 985-464-487-1

У зборнік у прадстаўлены розныя вершы апошніх гадоў, як спроба выказаць сваё стаўленне да розных з'яў жыцця і да сябе.

**УДК 821.6-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-6986-22-5**

© Ю. Нераток, 2003
© Афармленне
УП “Тэхнапрынт”, 2003

*БЕЛАРУСАМ*

*Пакуль здрабняем на зямным абрусе*
*мы маналіт мінулага на друз,*
*не згасне сонейка над Беларуссю!*
*...Але ці ведае яно пра Беларусь?*

*Пакуль рунее жытняя палоска,*
*і пожню сцеражэ саломы стог,*
*нас не пакіне міласэрнасць Боска!*
*...Але ці помніць беларусаў Бог?*

*Пакуль мы даглядаем захад продкаў,*
*пакуль нашчадкаў досвітак глядзім,*
*нас не звязе ў нябыт Харона лодка!*
*...Але ці трэба гэта нам самім?*

## *АД БЕЛАРУСАЎ*

*Бяззорней – лёс, імклівей – час.*
*Той б'е ў званы, той джалам круціць.*
*Чаго вы хочаце ад нас?*
*Ваду навошта каламуціць?*

*Навошта нас цягнуць у яр?*
*Вы хто? Калі ўжо разабрацца –*
*нашчадкі шляхціцаў, баяр,*
*ліцвінаў-вояў і казацтва.*

*А нам што веча, што статут,*
*што дзіды, што мячы, што шаблі.*
*Спрадвеку мучымся мы тут,*
*а зброя наша – плуг ды граблі.*

*Не трэба вабіць барацьбой,*
*і спакушаць не трэба раем!*
*Вы паваюйце між сабой –*
*мы, як заўжды, перачакаем.*

*КПЛІВАЕ ПРЫЗНАННЕ*

*Люблю цябе, народ мой памяркоўны,*
*за твой працоўны сверб і нораў роўны;*
*за тое, што ў сабе, як струк гароху,*
*што цягнеш воз свой ды крадзеш патроху;*
*за тое, што начальства паважаеш,*
*на здзекі і насмешкі не зважаеш;*
*за звычку, што характар твой стварае:*
*каб хатка між людзей, а хлеўчык з краю;*
*за простую, як ношка сена, сутнасць,*
*за тое, што ты супраць тых, хто "супраць";*
*за тое, што і ў слова, і ў паперку*
*ты верыш, як яны ад тых, хто зверху;*
*за тое, што ты за сябе хітрэйшы –*
*што ты не беларускі, а тутэйшы.*

*ТАЛЕРАНТНАМУ*

*Ты сёння маеш выгляд млосны:*
*сядзіш пакрыўджаны і злосны*
*і зразумець не можаш сам,*
*за што цябе пакрыўдзіў хам.*

*Ты нарадзіўся не заўчора*
*і ведаеш: бяда – не гора.*
*То лепш бы плечы распрастаў*
*і адхвастаў, каб той не ўстаў.*

*А не – гімнастыка такая:*
*сціскай далонь, калі пустая.*
*За горла ўзяць – не за гужы,*
*бо ён жа – пан, а ты – мужык.*

*Таму ты будзеш ногці грызці,*
*пакуль нарэшце знойдзеш “выйсце”:*
*у клетку шуснеш, быццам трус.*
*А як інакш? – ты ж беларус.*

## *ХВАРЭЮ*

*Пасляпрацоўны цёмны час.*
*Упёрлася ў тралейбус нас,*
*лічы, Мамая войска.*
*Дыхнуўшы ў твар мне тым, што піў,*
*мужык спытаў, як цвік забіў:*
*– Я еду ў бок Лагойска?*

*– У тым напрамку.*
*– З працы прэш?*
*І плацяць трохі ўрэшце рэшт?*
*– А ну іх! Больш чакаем…*
*– А што ж ясі?*
*– Ды штосьці ем…*
*– А ў цэлым як?*
*– Ну як? Жывем.*
*А хто памрэ – хаваем.*

*Відаць, недаспадобы быў*
*яму нудотны мой матыў,*
*і ад жыццёвай прозы*
*зноў збіў мяне знянацку ён*
*на свой экстравагантны тон:*
*– А ты чаму цвярозы?*

*Ён па-блазнерску падміргнуў*
*і іранічна працягнуў:*
*– Ну, я з цябе дурэю!*
*І, як перад сабой самім,*
*я апраўдаўся перад ім:*
*– Хварэю я, хварэю…*

## *АСАЦЫЯЦЫІ ПАСЛЯ МІТЫНГУ*

*Дзяўбуць, што нібы ўсё ідзе на лад.*
*Ды не заўсёды зроку можна верыць:*
*усё, што за акном, плыве наперад,*
*калі састаў кранаецца назад…*
*………………………*
*Паказваюць у кадры аднаго,*
*тлумачаць, што ён дрэнны, адыёзны.*
*Валтузіць вецер валасы яго.*
*Ён штось крычыць настойліва, сур'ёзна.*

*А вось другі раскладвае пасьянс*
*сваёй калодай – вынік прадказальны:*
*для аднаго – адваяваны шанс,*
*а для другога – гармідар вакзальны.*

*…Дайжэзная калона напрасцяк*
*ідзе – і ёй праспект здаецца вузкім.*
*Падтрымкай аднаму лунае сцяг.*
*Другому ж ганьба – словам беларускім.*

*Але для тых, хто дзень у хаце кіс*
*ці корпаўся на дачы сярод градак,*
*адзін – неўтаймаваны экстрэміст,*
*другі – надзея, чэснасць і парадак.*

*…Хоць стома не пакінула вачэй,*
*ды развялі два мужыкі бадзягу:*
*– Што швэндацца, размахваючы сцягам?!*
*– Яно-то так. Дубінкамі – ямчэй…*

*Скарочаны маршрут. Усё, шабаш.*
*І разам выйсці прыйдзецца з салона –*
*з раскладу выбіўся тралейбус наш,*
*калі на мітынг крочыла калона…*

## СВАТАЎСТВА

*І з нівай роднаю і з хатаю*
*(як бы ў пасаг – каб сплавіць з рук)*
*цябе, задрыпаную, сватае*
*былы саўгасны палітрук.*

*І між хвалебнымі прамовамі*
*на вуха сват табе вярзе:*
*“Ён хустку купіць табе новую*
*і з рынку пернік прывязе…”*

*І сват глядзіць з усмешкай строгаю!*
*Калі ўсумнішся спакваля –*
*ён тузане за косы доўгія*
*ці дасць у рэбры кухталя.*

*“Ну што ж, як твар – чырвонай цэглаю?*
*Ну што ж, калі была турма?*
*Не трэба ўпарціцца, нягеглая! –*
*і споднягa ў цябе няма!”*

*Жаніх стаіць і пасміхаецца,*
*як над халопкаю барон.*
*І перад сватам выстаўляецца,*
*якім ёй мужам будзе ён.*
*Што быць яму заўжды свабодпаму*
*(і не пярэч, калі кірнуў!),*
*што ён нядаўна брату зводнаму*
*прыкладам скіўіцу звярнуў,*
*што гаспадарка – заняпалая,*
*што дзеці з голаду крычаць…*

*…Ды і ў самога з ботаў ялавых*
*анучы брудныя тырчаць…*

*Так і стаіш, істота, рабская –*

*ці то ў паўсне, ці ў забыцці…*
*Відаць, такая доля бабская:*
*хто возьме – за таго ісці.*

*ВАЙНА ЦІ МІР*

*1*

*“Беларус” узрывае дзірван,*
*птушкі ў лесе шчабечуць звонка.*
*А ў вушах – бы крычыць груган –*
*медыцынскае слова “зялёнка”.*

*Трэск бяздушны – ва ўсе бакі,*
*перакрытыя праўды краны.*
*Але слова “баевікі”*
*успрымаецца, як “партызаны”.*

*Скарга праз апантаны свіст:*
*“Крыўдзяць злыдні малыя большых!”*
*Кулямётнай чаргой: “Тэрарыст!”*
*А ідзе на ўспамін “падпольшчык”.*

*Каб пазбавіцца ад турбот,*
*негалосна прапісаны лекі.*
*Ёсць дыягназ: “Бандыцкі народ”,*
*а дакладней – “недачалавекі”.*

*Хоць да самай драбніцы цярусь,*
*атрымаюцца тыя ж “Итоги” –*
*прад’яўляе мая Беларусь*
*калькаваны чарцёж аналогій.*

*2*

*Адурэў ад унутраных здрад*
*і душу даручыў аўтамату...*
*Ты ўварваўся, “старэйшы брат”,*
*з кулакамі ў чужую хату.*

*А ў той хаце бандыт сядзіць*
*і спрабуе абараніцца.*
*А яго спадзяецца дабіць,*

*знішчыць хлопец з Чыты – “вызваліцель”.*

*Ёсць вайна ці няма вайны?*
*Ды не вернеш ужо нічога*
*тым, чые палеглі сыны*
*за ганебную перамогу.*

## *У ЦАРКВЕ*

*Скіну стому і развею нуду –*
*нехрышчоны, да царквы забрыду.*
*Разбазару грошай стос на хаду –*
*у працягнутыя рукі ўкладу.*

*У царкоўнай крамцы свечку куплю,*
*запальнічкаю яе падпалю,*
*папалам з грахом грахі замалю…*
*Не вяртайся, Божы Сын, на Зямлю.*

*Акунуся, бы сякера ў ваду,*
*у малітваў і крыжоў чараду,*
*і засмяглую душу наталю…*
*Не вяртайся, Божы Сын, на Зямлю!*

*Тут усё – як і прадбачыў прарок.*
*Правяць баль тут чыстаган і курок,*
*тут заўжды наверсе той ліхадзей,*
*які здолеў падмануць больш людзей.*

*У пашане той, хто можа забіць…*
*І нічога з гэтым нельга зрабіць!*
*Немагчыма душы іх скалануць…*
*Не вяртайся, Божы Сын, – зноў распнуць.*

## *ЦЕМРА*

*Водбліск неба разбіў,*
*і наслала ўздагон*
*вераб'іная ноч сваю хеўру.*
*...Адляцеў, як не быў,*
*растрывожаны сон...*
*І наткнуліся вочы на цемру.*

*Дождж не хлышча ракой,*
*не скуголіць гайня,*
*не шабашыць нячыстая сіла –*
*толькі змрок і спакой,*
*цемра і цішыня...*
*Што ж за трасца мяне разбудзіла?*

*І не помню, што сніў.*
*Ці жывы, ці памёр?*
*Без дыхання і пульсу ляжу я...*
*Хто ўвесь свет зачарніў,*
*хто той злосны грымёр,*
*што маю недалужнасць віжуе?*

*Ад жахлівай жарствы*
*нечакана хрыплю...*
*І кляну сваю псіхіку-сцерву!*
*А па тым, што жывы,*
*вызначаю, што сплю, –*
*і глыбей акунаюся ў цемру.*

## *ФОТААЛЬБОМ*

*Патрапіў зноў да лёсу я ў абдымкі,*
*душу мне прыкрасць наждаком скрабе…*
*Разглядваю ў альбоме фотаздымкі:*
*сягонняшні – мінулага сябе.*

*Маркочуся, бы ўночы на вакзале,*
*чакаю, калі змрочны час міне:*
*што мне мае адбіткі расказалі б,*
*каб давялося ім сустрэць мяне?*

*Вось гэты хлопчык – босы, языкаты…*
*(Такім не помню я сябе зусім!)*
*…Даў лататы, напэўна б, ён дахаты –*
*я рознюся ад тых, хто побач з ім.*

*А гэты – вучань. Клас, здаецца, сёмы.*
*(Ужо ў самога сын такі якраз!)*
*Са мной бы гаварыў, як з незнаёмым,*
*на "вы" мне штосьць мармычучы у адказ.*

*А вось студэнт – нястрыманы і бойкі.*
*"Ну што, жывы яшчэ? – спытаў бы ў жарт. –*
*Гарэлкі многа п'еш? Як я, ці колькі?*
*А хто ты там: паэт? пісьменнік? бард?"*

*А вось жанаты я – сур'ёзна-жвавы.*
*Сказаў бы сам сабе: "Не палысеў…*
*Дзяцей ці шмат? Як з фізкультурай справы?*
*А як мужык – не надта паслабеў?"*

*Вось на рабоце я. Ды іранічна*
*кажу сабе: "Не выйшаў ты ў чыны…*
*Як там перабудова – дынамічна?*
*А хто на самым версе – зноў яны?"*

*А вось і я часоў гандлярства ў Польшчы –*
*уеўся ў пухавік баула гуж.*
*“Прыкід нармальны – пэўна, маеш грошы…*
*Што?… На табе той самы капялюш?!”*

*Зусім нядаўні здымак разглядаю –*
*як у люстэрка на сябе гляджу.*
*…Ён ні аб чым мяне не запытае,*
*нічога я яму не раскажу…*

*Але пара з сабой у часе зліцца –*
*ад варажбы не стане весялей!*
*Альбом, закрыўшы, кіну на паліцу.*
*І буду жыць далей, далей, далей…*

*Я ХАЧУ ЖЫЦЬ У ВОЛЬНАЙ КРАІНЕ*

*Цішыня. Але, дзякуй Скарыне,*
*можна моўчкі яшчэ гаварыць:*
*“Я хачу жыць у Вольнай Краіне!” –*
*і трызнення майго не скарыць.*

*Не жадаю карпець пад “дзяржавай”,*
*што трымае няўмольнай рукой,*
*неахайнай, жалезна-іржавай*
*за гарляк непакорлівы мой.*

*Мне “рэспубліка” не даспадобы,*
*бо які-небудзь спрытны круцель*
*пад падставай публічнасці спробы*
*замест вежы збудуе бардэль.*

*А “саюз” – гэта путы абодвум,*
*а “садружнасць” – як выпіць што ёсць,*
*“федэрацыя” – краты свабоды,*
*дзе ты не гаспадар і не госць.*

*...Ды не ведаю, песню якую*
*трэба сённяя народу спяваць,*
*каб Радзіму маю дарагую*
*мог я Вольнай Краінай назваць!*

## *ЖАБРАЦКАЯ*

*Не працягвай марна мне далонь, галеча, –*
*мне ў яе сягоння нечага пакласці.*
*Сам іду, панура апусціўшы плечы –*
*ні паперкі грошай, ні крупінкі шчасця.*

*Не глядзі з дакорам на мяне, старая, –*
*я і сам сягоння праклінаю долю.*
*Толькі я дакеміў, хто нас абірае –*
*ты ў сваім жабрацтве бачыш Боску волю.*

*Немагчыма звесці злыдняў тых, бабуля, –*
*нават на распяцце могуць ахрысціцца!*
*Толькі кол з асіны ці са срэбра куля –*
*ды аховы столькі, што не падступіцца.*

*Кінь свае спадзевы на мяне, старэча, –*
*я і сам сягоння бедны і галодны.*
*Для мяне, па-твойму, гэта недарэчна...*
*Але што ты зробіш – я паэт народны.*

*А як будуць грошы – п'яны і вясёлы*
*я цябе ўзгадаю ды яшчэ ў прыдачу*
*цыганятак бойкіх, хлопца з куксай голай*
*і дзядка сівога, што наўмысна плача...*

## *ТРЭЦІ ВАРЫЯНТ*

*Нас захліснулі часу злога хвалі –*
*спрачацца можа злодзей ці вар'ят.*
*Два варыянты нам прапанавалі…*
*Але магчымы трэці варыянт!*

*З іх першы: "перастройка" з дзікім рынкам,*
*дзе ўсё, што нам належыць, – "секандханд".*
*Дзе збыт ёсць недакуркам і скарынкам…*
*Задавальняе гэты варыянт?*

*Другі: застой з уладаю чырвоных,*
*дзе дэфіцыт, партком і правіянт,*
*здабыты па чарзе ці па талонах…*
*Ці не забылі гэты варыянт?*

*І так – і гэтак: быдлам быць ці цяглам,*
*ашыйнік начапіць, нібыта бант,*
*ці рохкаць, а як б'юць – вішчаць працягла…*
*Але магчымы трэці варыянт!*

*Даруй, народ, што выю, як ваўчыца:*
*паэт – сляпы прарок, а не гарант.*
*…Калі прымусіш ты з сабой лічыцца,*
*магчымым будзе трэці варыянт.*

*ДЗЕНЬ ПРАЙШОЎ*

*Дзень прайшоў, як заўжды, у грызні і хлусні:*
*хтосьці – здатны, а хтосьці – ахвочы.*
*І змяняе ягоны хаос мітусні*
*параўнальны спакой цёмнай ночы.*

*Сонца промні шпурне на палі і дамы –*
*і аздобіць у фарбы паўсвету.*
*І насупленасць лютай халоднай зімы*
*зменіць цёплай усмешкаю лета.*

*Кампраміснасць дабро знойдзе нават у зле.*
*Пройдзе рупнасць, і з’явіцца млявасць.*
*Бесклапотнасць дзяцінства ў нябыт адашле*
*абыякава-мудрая сталасць.*

*Суцяшаем сябе беспадстаўнай маной,*
*абнадзейлівай і неадступнай:*
*што бязглуздая жорсткасць эпохі адной*
*прадугледжвае ўзнёсласць наступнай.*

*Пэўна быццам бы ўсё, як гарох у стручку!*
*Ды бянтэжыць душа-верхаглядка...*
*Ёй здаецца: Сусвет – пругкі мяч з каўчуку,*
*што сціскае ў руцэ немаўлятка...*

*БАГІ*

*Навошта вам бераг другі*
*і безліч гадоў немаркотных?*
*А дзесьці сядзяць багі*
*і слухаюць енкі гаротных.*

*Ды глушыць іх веку спакон*
*свой гімн урачыста-хвалебны,*
*бо ўжо надакучыў ім стогн –*
*ліслівы, тупы, рабалепны.*

*“Чаго вам, стварэнні, яшчэ?!*
*Жыццё ж – немалы падарунак.*
*А Лета няспынна цячэ –*
*вы знойдзеце ў ёй паратунак!*

*Навошта ж душою крывіць –*
*і тузаць з-за дробязяў Бога?”*
*…І, каб яшчэ горш не зрабіць,*
*не робяць наогул нічога…*

## *ШПАЦЫР*

*Цямнее. Сыра, як у склепе.*
*Няма надзей, што будзе лепей.*
*І вецер цягне, бы ў трубе…*
*Ну што рабіць? – іду сабе!*

*Мне лістапад прастудай грозіць,*
*імжысты дождж схінае позірк.*
*Дрыготкі, слотны сквер маўчыць…*
*Ох, як бы ног не замачыць!*

*А мімаходзь пачую маты*
*падпітага “электарату”:*
*“Во, блін, пагода! Як жыццё!…”*

*…Ідзе прырода ў забыццё…*

СКАВЫТАННЕ НАЦЫЯНАЛІСТА

*Мне кажуць, што сягоння свята,*
*што гістарычны гэты год…*
*А я крычу табе зацята:*
*“Ты памыляешся, народ!”*

*Былыя ўспомніўшы грахі,*
*ты скажаш: “То ж быў час такі…”*

*Ляскочуць аб двухмоўі словы –*
*і ты цураешся нібы*
*сваёй сялянскай хатняй мовы,*
*што стала сродкам барацьбы.*

*Якое там двухмоўе, годзе!*
*Прадаў ты мову, мой народзе…*

*Ты кажаш: “Лепей разам будзе,*
*саюзна з братняю сям’ёй…”*
*У шматнароднай халабудзе*
*хто, апроч рускіх, родзіч твой?*

*Ці мо парадку ў інтэрнаце*
*больш будзе, чым ва ўласнай хаце?*

*І як жа так, развяж нас, Божа,*
*што самы люты вораг твой*
*той, хто чаўпе табе, што можаш*
*ты жыць сваёю галавой?!*

*А тых, хто нацкаваў ОМОНцаў,*
*прымаеш ты за абаронцаў…*

*Відаць, традыцыя такая:*
*ты дзелішся спакон вякоў*
*на тых, хто “панскі розум мае”,*

*і на “тутэйшых” мужыкоў.*

*Ты ўзяў удзел у барацьбе –*
*пазбавіў голасу сябе…*

*Калі ў сабе ты ўбачыш выйсце*
*і ачмурэння час міне?*
*Ці здолееш ты з багны выйсці?*
*Ці зможаш вольным стаць?… Ці не?*

*І я пытаю, сцяўшы рот:*
*“Дык ты народ ці не народ?!”*

*КАЛАМУЦЬ*

*Прашамацела шчасце міма…*
*Шкада, бо змарнаваны час.*
*І зноў далей усё магчыма.*
*А што? – пытанне не для нас.*

*Між хамамі і халуямі*
*пачуцці згінуць задарма.*
*Са рва з азызлымі краямі*
*жадання вылезці няма.*

*Пакуль прымерваў ты карону,*
*падкраўся раптам сталы век.*
*Раман не цягнецца да скону –*
*недасканалы чалавек.*

*Дзеля гульні з лазы гнуць дугі*
*лягчэй, чым лапці плесці, – факт.*
*Сваволіць проста без папругі,*
*шматкроць цяжэй чаканіць такт.*

*Але буслянка зноў без птушак,*
*уся ў асоце сенажаць.*
*І застаецца трэсці грушу*
*ці леску за карчагу рваць.*

*Не торгайся, не мітусіся,*
*не лезь у ружы басанож.*
*І адпаведна апраніся,*
*калі з нябёс пальецца дождж.*

*Сплаціць хацеў за волю кроўю,*
*а ці набыў хаця б ружжо?*
*Казалі ж: “Беражы здароўе!”,*
*але спажыў-прапіў ужо…*

*А каб што зверху не зляцела,*
*перачакай ці крок прыспеш.*
*І як бы часам не карцела,*
*старанна мерай – і не рэж.*

*Калі ж даверыш вывад зроку –*
*пра пошук існасці забудзь!*
*Бо, як зірнеш на ўсё звысоку –*
*вакол бардак і каламуць.*

*Дзе знойдзеш грош, дзе згубіш долар,*
*там стол халяўны, там – клазет…*
*Змяшаеш фарбы – чорны колер;*
*складзеш палітру – белы свет.*

## *РАКА*

*Як рака веснавая*
*крыгаход усчынае,*
*так душа мая рвецца*
*са смугі кіпцюрой.*
*Не шкадуй ты Радзіму,*
*ёй шкадоба – не дзіва.*
*Ёй патрэбны трэск пугі,*
*каб з запечку ўспарой.*

*Мне душу залівалі*
*то крынічныя хвалі,*
*то заводскія сцёкі,*
*то калгасны смурод…*
*Не шкадуй ты прыроду,*
*ты не знойдзеш з ёй згоду.*
*Не шкадуй ты народа –*
*дзе ты бачыш народ?*

*Плынь душы маёй, рэчкі, –*
*ад пустышкі да свечкі.*
*Дзе ў бязмежжа ўвальецца?*
*Дзе вытокі бярэ?*
*Не шкадуй небараку –*
*ён забудзе, што плакаў.*
*Не шкадуй недалугу –*
*усё роўна памрэ.*

## *ШТО ДАЛЕЙ?*

*Дзень булькнуў, як у рэчку камень.*
*“Жыць стала лепш і весялей” –*
*“чарніла” жлукціў з мужыкамі.*
*А што далей?*

*Лёс звыклы – чыгуном гантэляў,*
*а неразважнасць – наўздагон.*
*Відаць святло ў канцы тунэля…*
*І што з таго?*

*Фартуна блісне – шар у лузе,*
*часцей – не выпадае біць.*
*І сон дурны ідзе па крузе…*
*А што рабіць?*

*То дасць жыццё пад дых каленам,*
*то смехам абсмяе пустым.*
*І быць, напэўна, пераменам.*
*Але якім?*

*Анёлы плачуць, скачуць чэрці,*
*чакае да сябе зямля.*
*Калісьці прыйдзецца памерці…*
*А што пасля?*

## КРЫТЫКУ

*Штосьне ідзе радок сягоння першы.*
*Адвык ад мовы – слоўнік пад рукой.*
*Ды ведаю: чакае мае вершы*
*літаратурны хросны бацька мой.*

*Але прывольней сталі думкі ліцца,*
*спляліся ўсе пачуцці ў цесны рой…*
*Мне будзе чым перад табой хваліцца,*
*літаратурны хросны бацька мой!*

*…Са мною Муза час размовай бавіць,*
*аб чым – пакуль няўцямна ёй самой.*
*Ну, ні бяды! Як што не так – падправіць*
*літаратурны хросны бацька мой.*

## ЧАС ІДЗЕ

*Мой лёс драпежнікам-ваўком*
*наперадзе пільнуе.*
*А час асфальтавым катком*
*мінулае руйнуе.*

*І рэхам стрэлу прагрыміць*
*няўрымслівая памяць…*
*Ды ўжо нічога не змяніць,*
*нічога не падправіць.*

*Чарговы год замест “бывай”*
*сухой галінкай трэсне.*
*І сцісне сківіцы адчай*
*радком забытай песні…*

*САМОТА*

*Самота зіркне злоснай кобрай*
*і праслізне ў душу вужом.*
*Не зыч таму дарогі добрай,*
*хто выкрасліў цябе крыжом.*

*Жадаць не трэба ўваскрашэння*
*ілюзій, ад якіх адвык.*
*Хто сеяў шрот замест насення,*
*пажне не каласок, а цвік.*

*Калі ж каменне праўды жорсткай*
*сатрэ на пыл крышталь надзей,*
*хай не застране ў горле косткай*
*абломак крыўды на людзей.*

*НАВАЛЬНІЦА НАЧНАЯ*

*…Вечар спёку астудзіць, здавалася –*
*ды прыпар ірвануўся ў неба!*
*У спакой навальніца ўварвалася*
*спадзяванкаю-непатрэбай.*

*Можна плюшчыць санліва вочы,*
*затыкаць безнадзейна вушы:*
*праз павекі маланка праскочыць,*
*коўдра гулу грымот не заглушыць.*

*Вы хацелі?! Што ж плакаць-маліцца:*
*што прасілі – таму і мецца!*
*…Ноч прынесла з сабой навальніцу,*
*ад якое няма куды дзецца.*

*ПРАГНОЗ*

*Анахата – згодна з усходняй філасофіяй, верхняя (грудная) чакра.*
*(Слоўнік аўтара)*

*Яшчэ і снег сышоў не ўвесь,*
*а ты – аб леце…*
*Навокал – бруд, а ты – пра чэсць…*
*Пазбаў, паэце!*

*Не час з расхрыстанай душой*
*вандроўкі ладзіць!*
*…З азызлай роднаю зямлёй*
*табе не зладзіць.*

*Яшчэ табе мароз-кароль*
*уціcне плечы!*
*Застудзіць анахаты боль*
*імпэт хлапечы…*

*І ў час адлігі веснавой*
*няўдалай фразай*
*склізне няўстрым тралейбус твой*
*пад бампер МАЗа!*

*Здранцвелай ластаўкай, павер,*
*прадвесцем мая*
*ў сумёце тысячаў папер*
*твой верш сканае…*

## *НА ПРЫПЫНКУ*

*Навес на прыпынку зрабілі шыкарны*
*і разбурылі бардзюр тратуарны…*
*Я не смуткую – вершык чытаю*
*пра непаўторнасць роднага краю.*

*Пырснула лужына з-пад матацыкла,*
*хтось мацюкнуўся злосна і звыкла…*
*А я ўсё чытаю чулыя словы*
*пра мілагучнасць роднае мовы.*

*Крапае дождж, але мокра – не пыльна.*
*Тралейбус пад’ехаў, набіліся шчыльна…*
*Толькі бянтэжыць безварыянтнасць–*
*верш дачытаць пра талерантнасць.*

*РАЎНАДУШША*

*Стан здароўя – не адбавіць.*
*(Сплюнь і не грашы!)*
*Роўна дыхаю і нават*
*роўна на душы.*
*Ні журбе, ні думкам горкім*
*не скараюся!*
*Выйду ў горад надвячоркам,*
*прагуляюся.*

*Дагарэла сонца свечкай,*
*за дамы сцякло.*
*Цёплы вецер, ціхі вечар,*
*ліхтароў святло.*
*А з апошняй цыгарэты*
*ўецца сіні дым…*
*Адляцеў акраек лета.*
*Ну і ліха з ім!*

*Шэпчуць шынамі машыны,*
*зораць фарамі.*
*А мужчыны і жанчыны*
*ходзяць парамі.*
*Толькі дзе паненка тая,*
*што была маёй?*
*Ці сумуе, ці чакае?*
*Зрэшты, ліха з ёй!*

*Распрастаў, бы коўдру, неба*
*месяца ражок.*
*А што ўсё не так, як трэба, –*
*я прывык ужо.*
*Вось і выбраўся з балота,*
*у якое ўлез!*
*Спляжыў прыкрасць і маркоту*
*раўнадушша прэс.*

## *ВОЗ*

*Хлапчынкай шпарка па сцяжынцы крочыў.*
*А з боку – лес, з другога – рэчкі плынь.*
*Свяцілі дні, страшылі цемрай ночы.*
*То цень дажджу, то небакраю сінь…*

*Ды раптам стала сцежачка дарогай –*
*прасторы многа, свету і цяпла!*
*…Я не пачуў перасцярогі строгай –*
*прагледзеў, што ўгару яна пайшла.*

*…Караскаўся, збіваючы калені,*
*гульню жыцця ўспрымаючы ўсур'ёз!*
*І па дарозе назбіраў каменне –*
*імкненняў, клопатаў і звычак – воз.*

*Калі ж з гары прыспеў мой час спускацца,*
*лягчэй не стала – ціснe ззаду ён!*
*Не адпусціць яго, не адарвацца –*
*раздавіць, імкнучыся пад адхон!*

*…Ды прыйдзе час мне развітацца з возам.*
*Пад перапевы памяці званоў*
*знямоглым целам прасвятлелы розум*
*па зімняй сцежцы панясу я зноў…*

## *ПАЭТ І СНЯЖЫНКА*

*Паміж зямлёй і небам снег кружыўся,*
*і вечнай каляінай час ішоў…*
*Ляцела ўніз пушыстая сняжынка*
*з мільёнамі сяброўак і сяброў.*

*Збіралася ў хлюпоце на газоне*
*ў траве між недакуркаў паміраць.*
*Ды заляцела ў цёплыя далоні –*
*і ў іх не захацела раставаць.*

*Паэт, захоплены красой і чысцінёю,*
*Сняжынцы шчыра промні цалаваў,*
*і зоркай называў яе сваёю,*
*і разгарацца ёй дапамагаў.*

*Калі ж імпэт яго пачаў драбніцца –*
*спякотна стала з Зоркаю зусім.*
*Ён упрыгожыў Зоркаю звaніцу,*
*каб шчасце і надзею слала ўсім.*

*…І з ночы ў ноч, і з году ў год, Паэту*
*мільгаючы з нябёснай прасціны,*
*халоднай зоркаю зімой і летам*
*плыве яго Сняжынка ў вышыні…*

*ПЕСНЯ АНЁЛА*

*Ліха сатырам з кустоў забляяла.*
*Выгук савы раскалоў цішыню.*
*Змрок абступіў. Неяк холадна стала.*
*І цыгарэта мігнула агню.*

*Ды ненадоўга святла іх хапіла!*
*Свечкай, як німбам, свой твар асвячу,*
*і развяду свае белыя крылы,*
*і за аблокі ад вас палячу!*

*…Гне гарызонт залатою дугою*
*сонечны дыск, што ўсміхнуўся мне зноў.*
*Мяккім цяплом мае крылы лагодзіць*
*шчасце без межаў, любоў без краёў…*

*Я ажыву і душой уваскрэсну.*
*І без тугі, і без жалю аб Ёй*
*буду спяваць сваю светлую песню*
*з чыстых нябёсаў над грэшнай Зямлёй!*

*Лёсам нязвыклым сябе супакою.*
*Не завіруюся ў марнай журбе…*
*Ты не мая – і не будзеш маёю!*
*…Толькі вось як мне пражыць без цябе?…*

## *ТОЙ ГОД*

*Гадзіны пад няўмольным метраномам*
*знікалі, як зярняты ў баразне…*
*А я з табой спаткаўся днём вясновым,*
*калі наўзрыд ад сонца плакаў снег.*

*Ляцелі дні ў надзеі непрыкметна*
*і аблятаў, быццам квецень з лоз…*
*А я з табой кахаўся ноччу летняй,*
*калі зляцела зорачка з нябёс.*

*Затым былі спатканні і сустрэчы,*
*і хвосткі дождж цвярэзіў галаву…*
*А я згубіў цябе ў асенні вечар,*
*калі каштаны падалі ў траву.*

*І засыпае ранак снежным хлудам*
*марозная бясконцая зіма.*
*А снег скрыпіць бязлітасным прысудам*
*пра тое, што ў мяне цябе няма…*

## НЕ СТОЙ ПАД МАІМІ ВОКНАМІ

*Дробны дождж сцякае валокнамі –*
*і ў мяне на душы шэры дождж.*
*Ты не стой пад маімі вокнамі*
*і дарэмна мяне не трывож!*

*Я сказаў жа табе, што збудзецца.*
*Толькі што з маёй шчырасці той!*
*Ды не стой ты на мокрай вуліцы:*
*згубіш розум – не толькі спакой!*

*Ліхтароў святло ззяе іскрамі –*
*рассякае дажджу палатно.*
*Адыдзі, бо машына апырскае!*
*На дарогу глядзі – не ў вакно!*

*Я схаваўся за шыбамі мокрымі…*
*І сягоння мяне не чакай!*
*І не стой пад маімі вокнамі:*
*ты прамерзнеш, – прашу, уцякай…*

*ГАЛАЛЁД*

*Жыццё – як у полі барозны:*
*то лёс, то абставін збег.*
*…Уночы было марозна,*
*а зранку цярушыць снег.*

*За думкаю думка імчыцца,*
*узворвае памяць пласты…*
*Злачынцай на месца злачынства*
*прытэпаў я ў скверык пусты.*

*Ды хто ўжо цяпер разбярэцца,*
*хто скажа, чые там грахі!*
*Хто вогнішчу даў разгарэцца:*
*запалка ці порах сухі?*

*Мужчынскае сэрца слабое:*
*цягнуўся да ласкі цялём.*
*І блытаў другіх з табою,*
*як блытаюць вецце з галлём.*

*А ты ўсё шукала свой бераг,*
*як, лёд узарваўшы, рака.*
*…Змяняла стос вершаў-паперак*
*на палатно мастака.*

*Пара ўжо закончыцца трызне*
*і зноўку мне стаць на крыло.*
*Ды так час ад часу зацісне:*
*здаецца, што ўчора было!*

*Паплакаўся трохі – і годзе.*
*Хай ліха цябе абміне!*
*…Буксуюць па галалёдзе*
*стаптаныя боты мае…*

## ТЫ ТАКАЯ Ж

*То бязвольнаю трэскай плывеш,*
*то свабоднаю птушкай лятаеш,*
*то здаволішся тым, як жывеш,*
*то чагосьці чакаеш.*

*То заньеш бяссільна ў рукаў*
*і бязглузда на лёс наракаеш.*
*...Я нядаўна цябе напаткаў.*
*Ну, а ты ўсё такая ж.*

*Падзяліўся, бы ў некага скраў,*
*кампліментам тужліва-нахабным:*
*ты такая ж, якой цябе знаў,*
*нават стала прывабней.*

*Дзе і як, хто куды і адкуль –*
*ну нашто нам пра тое размова?*
*Я табе спавядаўся, пакуль*
*не запнуўся аб слова.*

*А як толькі мой голас заціх,*
*знесла гонар мой думкай цвярозай:*
*пасмяялася з вершаў маіх*
*і пакпіла над прозай.*

*А як толькі ліхтар заблішчэў,*
*“Час ісці па дамах”, – намякаеш.*
*Я, здаецца, кахаю яшчэ –*
*ну, а ты ўсё такая ж...*

## НЕКАХАНАЙ

*Я з сябе не выходжу,*
*сам сабе не ўздыхаю*
*і пагляд не адводжу,*
*бо цябе не кахаю.*

*Я не добры, не злосны,*
*не бяздарны, не ўмелы.*
*І таму верш мой просты,*
*што сюжэт зразумелы.*

*І бывае – смяюся,*
*а часцей – пазяхаю…*
*Я цябе не баюся,*
*бо цябе не кахаю.*

## *ВЕЦЕР*

*Не з дуброў, не з палёў*
*ветру дзёрзкі напеў.*
*Нехта смецце падмёў*
*ды прыбраць не паспеў.*

*Ветру што? – ён чужы*
*беспрытульны бядак:*
*што слупы – што крыжы,*
*што бялізна – што сцяг.*

*Разграбае, як звер,*
*і шпурляе наўкол*
*хлам бязглуздых хімер*
*і ашмоцце радкоў.*

*Што яму? – ён ляціць*
*то наўскос, то наўздоўж!*
*…Раптам вецер прыціх –*
*астудзіў яго дождж.*

*БЯССНЕЖНАСЦЬ*

*Нежылымі здаюцца дамы,*
*а паветра – са смакам хурмы.*
*Пасля досыць лагоднай зімы*
*ўсё ў адчайным экзальце.*
*Самаўпэўнены выгляд цяпер*
*выклікае ў душы недавер.*
*Вецер рвецца, як спуджаны звер,*
*па астылым асфальце.*

*І трасуцца тужліва кусты,*
*і грукоча тралейбус пусты,*
*і абгорткі ляцяць, як лісты, –*
*ды няма адрасата.*
*Не такі, каб замерзнуць, мароз,*
*хоць пранізвае сівер наскрозь*
*і гудзіць, як нацягнуты трос,*
*у рэжыме “легата”.*

*Дрэваў стромкіх пастрыжаны строй,*
*быццам спынены сілаю злой.*
*І калючае неба імглой*
*занавесіла сонца.*
*Паміж мной і Сусветам – сцяна.*
*Я не веру, што хутка вясна,*
*хоць навокал бясснежнасць. Яна*
*мне здаецца бясконцай.*

## ТУМАНЫ

*Туманы на белым свеце, туманы –*
*не праб'е іх чалавечы слабы зрок.*
*І хаця няма ні міру, ні вайны,*
*рызыкоўны кожны рух і кожны крок.*

*Туманы на белым свеце, туманы.*
*Ды такія, што сваіх не бачыш ног!*
*І нервуюцца, трывожацца званы,*
*і над марнасцю надзей смяецца Бог.*

*Туманы на белым свеце, туманы…*
*Толькі ветру хопіць моцы іх сагнаць.*
*Але ён вітае дзесьці ў вышыні*
*і пра тое, што мы ёсць, не хоча знаць.*

*Туманы на белым свеце – смутак мой.*
*Тут бялёса-шэры колер – уладар.*
*Пераход паміж жабрацтвам і турмой*
*сярод лёгшых на зямлю вільготных хмар.*

*Туманы… А ўсё астатняе – міраж.*
*І куды іду – паспеў ужо забыць.*
*Невядома, ці было калі інакш,*
*ды здаецца мне – інакш павінна быць!*

*Туманы, як слёзы, засцяць вочы мне.*
*Сэнс згубілі і эпохі, і часы.*
*…Можа, сонейка нарэшце адпачне –*
*і заззяюць яны кроплямі расы.*

## *МАЯ ВЁСКА*

*Мая вёска, мае Хадакі,*
*вы глядзіце ў чатыры бакі.*
*Толькі сонца зімою і летам*
*устае і садзіцца за лесам.*
*І да восені з цёплай вясны*
*гнёзды ладзяць на стрэхах буслы.*

*Мая вёска, мае Хадакі,*
*праляцелі над вамі вякі.*
*Толькі злыдням-чужынцам параю:*
*не чапайце вы нашага краю!*
*Тут народ працавіты, сялянскі,*
*а як што – баявы, партызанскі.*

*Мая вёска, мае Хадакі,*
*хай над вамі гучыць смех людскі.*
*Нараджаюцца хай пакаленні,*
*хай бароняць крыжы іх і цені*
*тых, хто жыў тут, а потым – і нашы:*
*крыкам ластавак з сенцаў паддашша.*

*Мая вёска, мае Хадакі.*
*Вы прабачце, што я вось такі:*
*што нядоўга, нячаста бываю –*
*можа здацца, што вас забываю…*
*Але верце, як роднаму сыну:*
*я вас помню любую хвіліну.*

*Мая вёска, мае Хадакі!*
*Тут шчыруюць мае землякі.*
*Бульба, сена, каровы і гусі,*
*як паўсюль на маёй Беларусі.*
*Але дзе б ні вялі мяне ногі –*
*не забуду да вас я дарогі.*

## *ГІБЕЕ ВЁСКА…*

*Гібее вёска на картоплях…*
*Я ведаю: цягнуся зноў*
*у край тарфоў і хмызнякоў*
*укласці поту свайго кроплю.*

*Удалы я – і не зняважу*
*сваёй работай гарадскіх!*
*Што зробіш? – многа нас такіх,*
*што на асфальт змянялі сажу…*

*Шыбую ў красамоўнай робе.*
*Хто? Чый? Адкуль? – даюць адказ*
*напорысты вусаты фас*
*і хітры лысаваты профіль.*

*Гні спіну і грабі-шчыруй…*
*Няхай міне прастрэлу куля!*
*…Ды лясне бульба, не гаруй,*
*Ягораўна – мая матуля!*

*РАЧКАВАННЕ*

*“Знаёмае вам слова? Спачуваю.*
*А нетутэйшым гэтак гавару:*
*ёсць завядзёнка дзіўная такая –*
*заўсёды ў вераснёўскую пару*
*на бульбу каларадскімі жукамі*
*з кашамі і капачкамі хадзіць,*
*а там перабіраць яе рукамі,*
*а ўвечары мяхі канём вазіць.*

*Дзяўбе зямлю рупліва, борзда, дбайна*
*ўвесь люд ад бабылёў да шкаляроў.*
*Навошта нам буржуйскія камбайны?*
*І так кіпіць работа – будзь здароў!*

*Дождж, вецер, пыл, парэпаныя рукі,*
*у спіну – лом, пясок – у валасы…*
*Глыні нагбом сялянскай той навукі*
*і ёлкім салам хвацка закусі!”*

*…Так я нудзеў суседу ў электрычцы,*
*які таксама ехаў рачкаваць.*
*Ён пагадзіўся: “Ёсць такая звычка.*
*Затое ўмеем хораша спяваць!”*

## ТРЫЗНА

*Пад страхой ржавеюць вілы,*
*сохне хілая вярба,*
*вянуць кветкі ля магілы –*
*з той нагоды і гульба.*

*Узгарыцца часам сварка –*
*што там воля і турма!*
*“Будзе скварка – будзе чарка…”*
*Толькі скваркі век няма.*

*Вепручка здалі за грошы –*
*павуцінне засціць хлеў,*
*мухі поўзаюць, як вошы.*
*А сабака – акалеў.*

*Пудзіла з падранай майкі,*
*заваліўся драхлы плот,*
*з-пад курэй суседскіх яйкі*
*крадзе зноў блыхасты кот.*

*Развіднее – будзе цяжка,*
*спахмурнее – весялей.*
*Пагудзі, пакуль ёсць пляшка,*
*а скапыцішся – сатлей!*

*Робіцца прывычнай цемрадзь,*
*глухнуць срэбныя званы…*
*А якому Богу верыць*
*у эпоху Сатаны?*

## *Я ВЫЙШАЎ НА ДВОР*

*Запальнічку – к цыгарэце:*
*зацягнуся ўсмак…*
*Уладарыць ціша ў свеце,*
*пустата ў мазгах.*
*Незнарок дзвярыма стукну,*
*чмыхну на хаду,*
*па цэментавых прыступках*
*басанож сыду.*

*Нечакана працяло*
*ветрам спіначку –*
*холад здзьмуў з мяне цяпло*
*за хвіліначку!*
*Час для злодзейскай работы:*
*вёска дрэмле ўся…*
*Прыладкуюся да плота*
*і агледжуся.*

*Комін спадцішка ўлавіў*
*рогі месяца.*
*І сабака дзіка ўзвыў –*
*хтось павесіцца!*
*Закрахталі хорам жабы*
*песню шлюбную…*
*І навошта ўстаў з канапы*
*ў ночку згубную?!*

*Зорку небасхіл шпурнуў*
*куляй трапнаю…*
*Разарвалі цішыню*
*рыкі трактара:*
*ашалелы “Беларус”*
*з “п’яным вожыкам”*
*успароў начны абрус*
*фарным ножыкам!*

*Дрыжыкі пайшлі па целе –*
*зірк управа я:*
*у хляве зашамацела*
*нешта жвавае!*
*І рассыпалася ўшчэнт*
*нават мысленне…*
*Бо яшчэ і тэстамент*
*не напісаны!*

*Пацямнелы панадворак –*
*толькі ценяў муць.*
*А таўкунчыкі “Сем сорак”*
*скачуць і пяюць.*
*Хто стаіўся ля павеці?!…*
*– гэта ж лесвіца!*
*…У кацяры – аж памерці! –*
*зрэнкі свецяцца!*

*Са спалоху-непакою*
*ў хату рынуўся…*
*Аб начоўкі (хрась!) – нагою,*
*ледзь не грымнуўся!*
*Мацюкнуся з перапуду:*
*“Трасца вам у бок!”*
*І на дзверы не забуду*
*зачапіць шчапок…*

*ЦІКАВАННЕ*

*З дому выскачу мячом,*
*і прайдуся тузам,*
*і на лаўку сяду ў скверы, як барон.*
*Пацікую за дзяўчом –*
*майка з голым пузам –*
*ці то ловіць жаніхоў, ці то варон.*

*З цыгарэтай – да мяне,*
*просіць запальнічку.*
*Хіба ж я не Праметэй – агонь трымаць?*
*Дзве зацяжкі – і капец,*
*лезе ў касметычку.*
*Пэўна, будзе гэта мышка паляваць.*

*Кінуць пасмачку на лоб,*
*сысуны падвесці,*
*вейкі выпрастаць, а бровы разагнаць…*
*І прыкідваць, як каго б*
*“на бабло развесці”.*
*Я сягоння не пусты – досыць цікаваць!*

## *ПІЛЬНАСЦЬ*

*Глюкавы – шчаслівы ў двукоссі, няўдалы.*
*Падмянціць – дзеяслоў ад назоўніка “мент”.*
*(Слоўнік аўтара)*

*Эх, удружылі нам нашыя пысы!*
*Вечар, напэўна, задужа глюкавы…*
*Мяне падмянцілі за тое, што лысы,*
*сябра – за тое, што дужа чарнявы.*

*Вырвалі гузік. Ідзі разбярыся:*
*дзе і навошта, як і каторы?!*
*Добра, што грошы амаль разышліся, –*
*ляснулі б, пэўна, у гэтай канторы.*

*Добра, што згрэблі не за ідэю –*
*юнак-мітынговец сядзіць, ледзь не плача.*
*Мы ж адзначалі сустрэчы падзею,*
*выйшлі – і трапілі ўраз пад раздачу.*

*Тырчым, як сычы, мы ў тым пастарунку.*
*Каб хоць не ўзгрэлі дручком па спінцы!*
*Няма нам ад пільнасці той ратунку –*
*і што ўжо казаць пра сапраўдных злачынцаў!*

## *САМ-НАСАМ З ЛЁСАМ*

*Мы дуэтам запяём*
*з лёсам-недарэкаю:*
*я зальюся салаўём,*
*ён закукарэкае!*

*Перастроімся наноў*
*з лёсам-небаракаю:*
*трубіць ён, як сем сланоў,*
*а я жабай квакаю!*

*То ён кіне мяне ў гразь,*
*то пакажа фігу мне!*
*Я замоўкну, як карась,*
*а ён толам выбухне!*

*Начаплю бронежылет –*
*ён засвеціць сонейкам,*
*сяду на веласіпед –*
*ён заскача конікам!*

*То запросіць мяне ў дом*
*з брамаю закутаю,*
*то падасць бакал з віном,*
*то фужэр з атрутаю!*

*Кладку выцягне з-пад ног,*
*усміхнецца крыва мне,*
*кіне грошай, каб не здох,*
*і кішэні выверне!*

*Напаскудзіць, як свінчо,*
*а пасля – пакаецца…*
*Будзе плакацца ў плячо,*
*там і адсмаркаецца!*

*Разагнуся ў клічнік я –*
*ён заверне ў косачку…*
*Колькі, блін, таго жыцця –*
*і яно ў палосачку!*

## *ПЕСНЯ ГАДА*

*Хоць пусці па сабе слязу,*
*хоць удар у літаўраў медзь!*
*…Вужанём у траве паўзу,*
*а за мною – з касою смерць.*

*Да мяне ёй – ніякіх спраў,*
*а ў мяне – аж гудзе ў вушах!*
*Я паўзу, аж жывот падраў…*
*Але толькі каса: шах-шах!*

*Адвядзі ад мяне касу,*
*перайдзі на другі пракос,*
*кінь няскошанай паласу –*
*дай схавацца ў прыцішку лоз!*

*Адвядзі касу, адпачні,*
*падмянташ яе, падвастры,*
*глянь на неба пустымі вачмі,*
*не нясіся няўспын і няўстрым!*

*…Толькі здарыцца ўсё не так –*
*не стаміцца тваёй руцэ,*
*не паспець мне схавацца ў кустах*
*ці ў туману густым малацэ…*

*Я хацеў уцячы, прабач –*
*як ад лёсу сябе схаваць?*
*…Хоць ты сам па сабе заплач,*
*бо няма каму шкадаваць.*

*МОГІЛКАВЫ СОН*

*Вуж прапоўз між ног –*
*а ногі босыя!*
*Дзе ляжаў вянок –*
*вецер гойсае.*

*Ці то крык сыча,*
*ці то філіна…*
*А сарочачка*
*не зашпілена.*

*А снапоў вузлы –*
*побач з лаўкаю.*
*І сабака злы*
*недзе гаўкае.*

*Дзе буяў палын –*
*лісце жоўтае.*
*Павучнёй галін*
*вецер боўтае.*

*І да ўсіх праяў –*
*месяц сколаты,*
*а дзе крыж стаяў,*
*камень – волатам!*

*Захацеў прысесць,*
*як заведзена:*
*у пакет палез –*
*усё з’едзена.*

*Сеў на бэлечцы*
*каля плота я,*
*а ў бутэлечцы –*
*твань балотная.*

*Ні жуда, ні жах –*
*боль са скрухаю.*
*Прэсам у грудзях*
*сэрца бухае.*

*І сасна скрыпіць,*
*напінаецца...*
*Ну, дык што рабіць?*
*Прачынаюся.*

*СУПОЛКА “КРЫЖАЧОК”*

*Крыжачок – 1. таннае “чарніла”;*
*2. уст. беларускі народны танец.*
*(Слоўнік аўтара)*

*Як не аддаць рэальнаму належнае?*
*Ды кіну вам выратавальны круг:*
*няхай не лямантуюць “незалежныя”*
*– яшчэ жыве нацыянальны рух!*

*Канае ціхім сконам апазіцыя:*
*паліт’інцэсты, комплексы, хапун…*
*Але жыве народная традыцыя,*
*старая, як спрадвечны дуб-рыпун.*

*Хто зверху – тым з назойлівасцю ўпартаю*
*шпурну, бы ў жарт, з нажыўкаю кручок:*
*закрыць усе суполкі, рухі, партыі,*
*прызнаць адну – суполку “Крыжачок”.*

*Не трэба ёй ні прэса і ні радыё –*
*заняткі ёсць другія для мазгоў.*
*Няма ні кіраўніцтва і ні рады ў ёй,*
*ні спіса, ні статута, ні сцягоў.*

*З’яднаныя ўсе ў ёй адзінай мэтаю,*
*адданыя агульнай барацьбе.*
*І ўзносы, што збіраюць скуль чорт ведае,*
*льюць з ненатольнай прагай у сябе.*

*Адзін другога пазнае па позірку –*
*ім дакумент – што зайцу парасон!*
*Калі за “поспех” вып’юць пасля “поспеху”,*
*то гэта – сход інкогніта персон.*

*Ёсць сярод іх студэнты і прафесары,*

*пенсіянеры, лётчыкі, “браткі”,*
*акцёры, мастакі, таксісты, слесары…*
*А хто сказаў, што сам ты не такі?*

*Іх Смерць пасе, як статак – ваўкарэзіна:*
*хто сэрцам кэхнуў, хто ў мароз скалеў,*
*хто збіты быў машынай, хто зарэзаны,*
*хто абарваў знянацку свой прыпеў.*

*Эх, рыцары падробачна-пладовыя!*
*Усім, пакуль надрыў мой не абрыд,*
*дам званне “Ветэран Перабудовы” я.*
*Паэтам (у дадатак) – “Інвалід”.*

*Няхай ваюць на Зямлі і міраццa,*
*там рысу, там бананаў не стае…*
*Іх – процьма, і рады суполкі шыраццa.*
*Душа за іх баліць: яны – свае.*

*Ах, Беларусь мая ты мутнавокая!*
*Пакінуў Бог сыноў тваіх, дачок…*
*Яны варон лічылі між аблокамі,*
*калі ім падмянілі “Крыжачок”…*

## *ТУГА ГАДОЎ*

*Ноч праляціць савой,*
*бязладным будзе ранне.*
*Гудзенне ў галаве,*
*а значыць – пуста ў ёй.*
*Гаркаваю травой –*
*звычайнае снядание,*
*а іней на траве –*
*сусветнаю журбой.*

*Стрыптызам таямніц*
*разбэрсаны паперы:*
*няма кахання ў іх,*
*а веры – пагатоў.*
*Пад стромкі скрып масніц*
*лёс стукаецца ў дзверы,*
*гагоча: “Што прыціх? –*
*Туга! Туга гадоў...”*

## *НА ДЗЯДЫ*

*Прыйшлі нашчадкі на магілы продкаў.*
*Усклалі кветкі, лісце падмялі.*
*Льюць успаміны разам з “Русской водкой”*
*пра блізкіх, што ў зямлю сышлі з Зямлі.*

*Успамінаюць цёпла, немаркотна*
*дасціпна...*
*...А ці так было ці не?...*
*І хтосьці ўжо смяецца бесклапотна,*
*а хтосьці ўспомніў клопаты свае.*

*Час загаіў іх смутак невылечны.*
*І кожны разумее ў глыбіні,*
*што сам ён, пэўна, не такі ўжо вечны,*
*як помнікаў гранітных камяні.*

*А тыя, хто сышоў, не наракаюць.*
*Іх душы церпяць: што рабіць? – радня!*
*І жвавымі вавёркамі чакаюць,*
*калі заціхне гэта мітусня.*

*ПЕРАХОДНЫ ЎЗРОСТ*

*Гасцей – не так, каб і багата.*
*Хоць джынсы цёртыя надзень!*
*Бо для мяне такое свята,*
*як для мінтая – рыбны дзень.*

*Без праўды – млосна, з праўдай – посна,*
*і факт любы – не адкрыццё...*
*Ужо, здаецца, марыць позна*
*і марна – планаваць жыццё.*

*Яшчэ, здаецца, хопіць сілы,*
*каб адбівацца ад няўдач.*
*Пакуль далёка да магілы,*
*хоць крылы распрастаў крумкач.*

*Ужо няёмка ў бойку лезці,*
*ды сорамна падціснуць хвост.*
*І маладосць, і старасць – дзесьці...*
*Няйначай, пераходны ўзрост!*

*Падводзіць вынікі – заўчасна,*
*рабіць высновы – сэнс які?*
*Як бы ўскараскаўся на прасла –*
*і ногі ў розныя бакі!*

*Віно ці воцат, пыл ці порах?*
*Звон ці ныццё, смоўж ці пчала?*
*...Я адзначаю сёння сорак.*
*Час падавацца да стала...*

## *ЗЛОСЦЬ*

*Не стрымаць мне настрою злога:*
*мне б гранату ці аўтамат!*
*Людзі-людзі, што ж вас так многа?*
*Людзі-людзі, што ж вас так шмат?!*

*Бессэнсоўныя вашы размовы,*
*вочы колюць, як вірлакі.*
*Раўнадушныя вы, як каровы,*
*і драпежныя, як ваўкі.*

*Ваш паток льецца брудлнай рэчкай –*
*я паўзу, як мурашка ў рукаў.*
*…Неяк дурань адзін са свечкай*
*сярод вас чалавека шукаў.*

*Вы чапляецеся плячыма*
*альбо сумкамі за мяне…*
*Вас цярпець ужо немагчыма –*
*зараз злосць цераз край ліне!*

*Што чакаць ад вас, аднадзёнак?*
*І адкуль вы? І хто вы ёсць?!*
*…Раптам позірк адкрыты – дзіцёнак…*
*І згарае, не ўспыхнуўшы, злосць.*

*БІНОМ*

*Ты ішоў па жыцці*
*незалежна і горда.*
*І імкнуўся ісці*
*не дугою, а хордай.*

*Ты людзям раздаваў*
*цеплыню і спагаду*
*і заўжды дараваў*
*раўнадушнасць і здраду.*

*Ты выходзіў у свет,*
*быццам гоншчык на трасу.*
*Быў любы твой праект*
*толькі справаю часу.*

*...А цяпер ты – біном:*
*раздваенне натуры.*
*Побач пляшка з віном,*
*ты бяздзейны і хмуры.*

*Ты чытаеш свае*
*замінулыя творы*
*і загаз, бы ў смале, –*
*ні здаровы, ні хворы.*

*Ненажэрна грызе*
*пацучыная скруха,*
*і слязою паўзе*
*па акне тваім муха.*

## *ПЛОТ*

*Дні страляюць чаргой няўмольнаю,
а бывае, што дзень – як год.
...На Апанскага бесканвойныя
рамантуюць турэмны плот.*

*Каб была агароджа бетонная:
ім сядзець бы, а ёй – стаяць.
Па-жыццёваму справа будзённая:
плот падгніў – трэба дошкі мяняць.*

*Што ж, каму астравы Канарскія,
але сёння няблага і ім.
Безмазольныя рукі цяслярскія
дапамогуць турэмным сваім.*

*Глянуць збоку: работа не танная!
Бездакорнасць пакінуць для кніг.
...Толькі зайздрасць прышчыміць спантанная,
што бяліць суправодзяць другіх.*

*МЕТАМАРФОЗА*

*Як быў малы – у торбу ўкласці –*
*назойліва, як авадзень,*
*сустрэчным цёткам цвыркаў “Драсьце!”*
*А мне з усмешкай: “Добры дзень!”*

*Цяпер я слова не пазычу –*
*ім пры сустрэчы кожны раз*
*дня добрага прыязна зычу.*
*...І “драсьце” бразгае ў адказ...*

*У ГОРАДЗЕ*

*Мой лепшы сябар, горшы вораг –*
*Хаос бязладны, зорны свет.*
*...Збіраўся паляцець да зорак,*
*ды не ўдалося неўпрыкмет.*

*Перакрыўлюся ўсмешкай панка*
*і прасвятлею, як гусляр...*
*Успышкай велічнай маланка*
*нікчэмны высвятліць абшар.*

*"Усё не так! Дурны, як корак!*
*Галотна, хоць сябе прадай!"*
*...У горадзе не бачна зорак,*
*у вёсцы – не да іх, бадай.*

*ПАЭТАМ*

*Яны гараць – таму і замярзаюць,*
*душой паны і целам жабракі.*
*Скрозь вечны змрок паэтаў зоркі ззяюць.*
*І свеціць кожная ва ўсе бакі.*

*І як не саладзі, а прысмак горкі.*
*Як не спяшайся – спынішся ў хадзе.*
*Паэзія – святло пагаслай зоркі:*
*няма паэта, а святло – ідзе.*

*Каго пакрыўдзіць лёс, каго – прывеціць.*
*Згарэць ад страсці ці сатлець з нуды…*
*Адны пагаснуць – новыя засвецяць.*
*І не дадуць аслепнуць назаўжды.*

*БЯЗЛЮДДЗЕ*

*Шарэе зямля, і хмурнеюць нябёсы.*
*Світанак у прыцемак зноў перайшоў.*
*Сосны скрыпяць, як старыя калёсы.*
*Знікла бязладдзе людзей-мурашоў.*

*Шапоча бяроза, струменіць крыніца,*
*Поўня за лес векавечны спаўзла…*
*Толькі не хоча душа прымірыцца*
*З тым, што няма ні дабра тут, ні зла.*

## *ПЕРАПЕЎ*

*Ціхаю рэчкаю – песня нясмелая,*
*хмараю дымчатай сонца закрытае.*
*Ой ты, надзея мая спарахнелая!*
*Ой жа ты, мара мая незабытая!*

*Згубленым рэхам – падзеі даўнейшыя,*
*мокне ад роспачы восень дачасная…*
*А ці былі вы, гады мае лепшыя?*
*А ці ляцелі з нябёс зоркі шчасныя?*

*Песня заціхне струною парванаю,*
*гукам фальшывым, няскончанай нотаю…*
*І адгукнецца душа закілзаная*
*болем і жалем, журбой і маркотаю.*

*ПАЭТУ Ў САБЕ*

*Круці, памыляйся, грашы,*
*а потым маліся старанна…*
*Не змыць табе плямы з душы,*
*пакуль яна з целам з’яднана.*
*Ды толькі надзею пустую пакінь,*
*што ёсць паратунак у слове “амінь”!*

*І ветрам здзімаецца гмах,*
*табой збудаваны бяздарна,*
*а высланы цернямі шлях*
*пакрыты плітой тратуарнай.*
*Усім зразумела – другі быў намер,*
*ды хто ж дасць яшчэ адну спробу цяпер?*

*Ты думаў – з паперы шматоў*
*злятаюць крыштальныя ноты.*
*Ты верыў, што пабач натоўп,*
*а сам вар’яцеў з адзіноты!*
*Ты марыў пазбавіцца марнасці дзён.*
*Той час наступіў, а ці радасны ён?*

*Ты зведаў, што ў шклянцы віно*
*істотней, чым кветачка ў вазе.*
*А гора і радасць – адно,*
*і сутнасць – у іх раўнавазе.*
*А сутаргі цела, душы каламуць*
*не могуць нязменнасць хаосу скрануць.*

*Цябе прывучыў ужо час,*
*што нельга публічна прарочыць,*
*што зло і дабро – толькі ў нас,*
*на нас – і знішчэнне, і творчасць.*
*…Ды толькі, каб тое спачатку дайшло,*
*напэўна, наогул цябе б не было…*

## *Я ХАЧУ*

*Не праныра, не дыпламат,*
*і не веру, што ёсць чарадзеі.*
*Я хачу… І жаданняў зашмат,*
*бо яны спараджаюць надзеі.*

*Я хачу свой пакінуць след,*
*бо жыццё ўсё ж даецца ў знакі.*
*Я хацеў бы адчуць гэты свет*
*зрокам птушкі і слыхам сабакі.*

*Я хачу над Зямлёй узляцець*
*і даведацца, хто яе круціць.*
*Каб душа не магла сатлець,*
*каб саромеўся той, хто схлусіць.*

*Каб азарт – без вялікіх страт,*
*і без рызыкі – перамены,*
*каб сяброўства было без здрад,*
*а партнёрства было сумленным.*

*І каб пыл не збіраўся на шкле,*
*каб каханне было бясконцым,*
*каб старыя жылі ў цяпле,*
*каб малыя гулялі пад сонцам.*

*Каб не падаў на квецень град,*
*каб не пуста было ў талерцы,*
*калі мір – без падману і звад,*
*а вайна – без калецтва і смерці.*

*Каб у твораў былі чытачы –*
*як таго не жадаць паэту!*
*І яшчэ (хоць бязглузда гучыць):*
*каб той свет быў не горшы за гэты.*

*НЕ ПІШЫ*

*Не пішы пра тое, як чаромха пахне –*
*без цябе квітнее, без цябе зляціць.*
*Не пішы, што ніваліўня марна прагне,*
*бо яе вадою з верша не паліць.*

*Не пішы, як спеюць журавіны ў багне*
*і як грыб крамяны тоіцца ў бары.*
*Не пішы пра вёску, у якую цягне –*
*жыць табе да скону ў каменным муры.*

*Не пішы пра блізкіх, родных і суседзяў.*
*Тое, што ты бачыш, – не агонь, а дым.*
*Не пішы пра дзеі, што сягоння ўгледзеў –*
*вочы і галовы Бог раздаў усім.*

*Не пішы пра заўтра, бо прарок ты кепскі.*
*Добрага б спалілі – ты жывеш пакуль.*
*Не пішы пра храмы, абразы і фрэскі.*
*Не жадай чужога – ні вянцоў, ні куль.*

*Не пішы пра німфу, што цябе кахае, –*
*здраджваюць і тыя, з кім з'еў солі пуд.*
*Не пішы, якая смерць цябе чакае –*
*вынесеш і здзейсніш сам сабе прысуд.*

*Не пішы, што любіш ты сваю Радзіму –*
*ёсць народ, улада і твой родны кут.*
*Не пішы; "у мовы – скрушная часіна".*
*Ты ўжо сам стаміўся ад сваіх пакут.*

*Не пішы пра тое, што твой век караткі –*
*абаранак большы, чым у ім дзіра.*
*Не пішы пра сонца, вецер і аблокі –*
*вечнасць не пачуе піску камара.*

*Не пішы пра тое, што на сэрцы дрэнна,*
*бо ў людзей хапае без цябе праблем.*
*Не пішы пра тое, як пісаць патрэбна.*
*І яшчэ пра тое, што бракуе тэм.*

## ЗМЕСТ

БЕЛАРУСАМ
АД БЕЛАРУСАЎ
КПЛІВАЕ ПРЫЗНАННЕ
ТАЛЕРАНТНАМУ
ХВАРЭЮ
АСАЦЫЯЦЫІ ПАСЛЯ МІТЫНГУ
СВАТАЎСТВО
ВАЙНА ЦІ МІР
У ЦАРКВЕ
ЦЕМРА
ФОТААЛЬБОМ
Я ХАЧУ ЖЫЦЬ У ВОЛЬНАЙ КРАІНЕ
ЖАБРАЦКАЯ
ТРЭЦІ ВАРЫЯНТ
ДЗЕНЬ ПРАЙШОЎ
БАГІ
ШПАЦЫР
СКАВЫТАННЕ НАЦЫЯНАЛІСТА
КАЛАМУЦЬ
РАКА
ШТО ДАЛЕЙ?
КРЫТЫКУ
ЧАС ІДЗЕ
САМОТА
НАВАЛЬНІЦА НАЧНАЯ
ПРАГНОЗ
НА ПРЫПЫНКУ
РАЎНАДУШША
ВОЗ
ПАЭТ І СНЯЖЫНКА
ПЕСНЯ АНЁЛА
ТОЙ ГОД
НЕ СТОЙ ПАД МАІМІ ВОКНАМІ
ГАЛАЛЁД

ТЫ ТАКАЯ Ж
НЕКАХАНАЙ
ВЕЦЕР
БЯССНЕЖНАСЦЬ
ТУМАНЫ
МАЯ ВЁСКА
ГІБЕЕ ВЁСКА...
РАЧКАВАННЕ
ТРЫЗНА
Я ВЫЙШАЎ НА ДВОР
ЦІКАВАННЕ
ПІЛЬНАСЦЬ
САМ-НАСАМ З ЛЁСАМ
ПЕСНЯ ГАДА
МОГІЛКАВЫ СОН
СУПОЛКА “КРЫЖАЧОК”
ТУГА ГАДОЎ
НА ДЗЯДЫ
ПЕРАХОДНЫ ЎЗРОСТ
ЗЛОСЦЬ
БІНОМ
ПЛОТ
МЕТАМАРФОЗА
У ГОРАДЗЕ
ПАЭТАМ
БЯЗЛЮДДЗЕ
ПЕРАПЕЎ
ПАЭТУ Ў САБЕ
Я ХАЧУ
НЕ ПІШЫ

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

Літаратурна-мастацкае выданне

Нераток Юрась (Гарбачоў Юрый Юр'евіч)

**ФОТААЛЬБОМ**

Вершы

Адказны за выпуск А. П. Аношка
Рэдактар У. М. Казбярук
Тэхнічны рэдактар А. А. Аўруцін
Карэктар Н. Б. Кучмель
Вёрстка і арыгінал-макет аўтара

Падпісана да друку 15.09.2003. Папера афсетная. Фармат 84x108/32. .Гарнітура Inform/ Lher factnys/ Умоўн.-друк. арк. 2,5. Ул.-выд. арк. 4,7.
Тыраж 250 экз. Заказ 237.

Выдавецтва УП "Тэхнапрынт"
ЛВ № 380 ад 28.04.99.

Аддрукавана на УП "Тэхнапрынт".
№203 ад 26.01.03.
220027, Мінск, пр-т Ф. Скарыны, 65, корп. 14, к. 215
тэл. 231-86-93